## Восеньскае апавяданьне пра тое, чым захапляўся паэта Вікенцій Шышко з вуліцы Казлабродзкай

Сьвет захапленьняў нічым ня меншы за сьвет Божы. Папросту гэта той самы сьвет.

У доме нумар 2 па вуліцы Казлабродзкай жывуць аматары самых розных захапленьняў.

Настаўнік фізыкі Шальчэўскі, яшчэ кавалер, у свае 34, зьбірае розныя выразкі з газэтаў і прыклейвае іх да сьценкі. Некаторыя з выцінак адклеіліся і зьвісаюць, нібы старыя скальпы са сьценак (ці як там яны ў іх называюцца) вігвама маршчыністага індзейскага правадыра.

Удава адстаўніка баба Марфа, якую жыхары дома, у залежнасьці ад узроставай і сацыяльна-адукацыйнай прыналежнасьці, назваюць Марфаю-пасадніцаю, -асадніцаю або -задніцаю,
— дык вось баба Марфа за ўпадабаны
занятак мела чытаньне кулінарных кніг. Яна магла гадзінамі сядзець на маленькім услончыку ў вітальні і захапляцца чарговым рэцэптам, на падставе пераліку інгрыдыентаў уяўляючы, што за страва магла б атрымацца! Гэтак глухі Людвік ван Бэтговэн па нотах летуцеўся ад музыкі, імі выражанай.

Старажыд нашага дома Самуіл Аронавіч Ліс, які ў дэталях памятаў цырымонію пахаваньня цадыка Іцхока ў 1932 годзе, зьбіраў старасьвецкія аўтамабілі. Праўда, ягоная калекцыя была невялікая — яна складалася з аднае адзінае адзінкі. Але ж якой!

Распавядаючы пра яе чарговай ахвяры — слухачу яго бясконца падрабязных гісторыяў, — калекцыянэр прыкладаў палец па вуснаў і ціха скрыпеў: «Ві панімаеце, это такая же рэліквія, как «Аврора». Да. Патаму что в эту машіну садзілся Ленін, кагда в йіво стрыляла Фаіна Каплан...»

Пасьля ўсяго згаданага, вы, мяркую, ня зьдзівіцеся,
даведаўшыся, што і паэта Вікенцій Шышко таксама меў захапленьне:
Ён любіў катацца на трамваі.

*каля 1995*